Сямейная газета
Выпуск № 16 (59)



# Няма праблемы, калі ёсць Бог

У панядзелак ранкам прачнулася з панічнымі думкамі: «Колькі ж мне ўсяго трэба зрабіць! Як жа я ўсё паспею?» Два тэрміновыя артыкулы, што планавала дапісаць на выхадных, нават не адкрыла. Любімае варэнне з брусніц, што назбірала, так і не зварыла... Бо вярнулася на здымную кватэру позна, і аказалася, што ў мяне няма вялікага таза, каб змясціць за адзін раз туды ўсе ягады.

І вось еду на працу з роем праблем (іх насамрэч было больш, чым я пералічыла) у галаве. Якраз у гэты момант тэлефануе маці, яна таксама ў паніцы (і яе можна зразумець, за апошнія два месяцы ў бацькоў зламаліся пыласос, халадзільнік, мабільнік, парнік...): «Гэта ты тэлевізар сапсавала? (Я ездзіла на выхадныя дадому.) Ён не паказвае...» — «Ну, вядома, не. Ты ж ведаеш, што я ўжо больш як 10 гадоў не гляджу тэлевізар...»

Толькі паспела пакласці трубку, як раздаўся званок ад расхваляванай маці мужа: «Што гэта Вова трубку не бярэ? Можа, з ім што здарылася?»

Як вы здагадаліся, ніводнага артыкула я ў той дзень не дапісала. Мне не давалі засяродзіцца хваляванні абедзвюх матуль і нязваранае бруснічнае варэнне. Разумела, што марную энергію ўпустую, але нічога не магла з сабой зрабіць.

Увечары муж, убачыўшы, што я вярнулася дадому сама не свая, запытаўся, што здарылася. І замест таго, каб суперажываць, узяў у рукі кубак з вадой, выцягнуў яго наперад і спытаў:

— Як ты думаеш, колькі важыць гэты кубак?

— Трыста грам! — адмахнулася я.

— А што адбудзецца, калі я буду так трымаць яго на працягу некалькіх хвілін?

— Нічога!

— А калі гадзіны дзве?

— Ты стомішся.

— А калі цэлы дзень?

— Ты вельмі моцна стомішся. А рука анямее і яе паралізуе, калі ты не апусціш яе.

— Як, па-твойму, вага кубка зменіцца ад таго, што я яго цэлы дзень буду проста трымаць?

— Не!

— А што трэба рабіць, каб усё гэта выправіць?

— Проста пастаў кубак на стол!

— Сапраўды! — радасна адказаў муж. — Так і з усімі жыццёвымі цяжкасцямі. Варта падумаць пра якую-небудзь праблему некалькі хвілін, і яна апынецца побач. Калі думаць пра яе некалькі гадзін, яна пачне засмоктваць. Калі думаць пра яе цэлы дзень, яна нас паралізуе. Можна думаць аб праблеме, але, як правіла, гэта ні да чаго не прыводзіць. Яе «вага» не паменшыцца. Справіцца з праблемай дазваляе толькі дзеянне. Трэба вырашыць яе або адкласці ўбок.

...У той вечар я зварыла бруснічна-грушавае варэнне — столькі, колькі змясцілася ў трохлітровую каструлю. Астатнія брусніцы, па парадзе сяброўкі, проста перацерла з цукрам, карыцай і імбірам. Чым вельмі парадавала мужа, які адразу быў супраць таго, каб я знішчала жывыя вітаміны на агні. Толькі паспела раскласці смакоцце ў слоікі, як патэлефанавала радасная мама: аказваецца, тэлевізар не зламаўся, а проста быў у спячым рэжыме, у які яго выпадкова, націснуўшы не тую кнопку, паставіў тата. Што тычыцца Вовы, то, як вы ўжо зразумелі, ён жывы і здаровы. А не адказваў на званкі, бо проста забыўся дома тэлефон. Артыкулы (у тым ліку і гэтую калонку) я таксама дапісала — на наступны дзень, прычым вельмі хутка.

...Сёння зноў прачнулася з роем мітуслівых думак у галаве. Хацела па звычцы пайсці ў іх на павадзе, але прыгадала кубак з вадой у выцягнутай руцэ і Амара Хаяма, які раіў: «Не кажы Богу, што ў цябе ёсць праблема. Павярніся да праблемы і скажы, што ў цябе ёсць Бог».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*dryla@zviazda.by*

■ Тыя, хто побач

# «Я не баюся выглядаць смешнай»

## Карэспандэнты «Звязды» завіталі ў госці да сяміразовай бабулі, больш вядомай як клаўнеса Люся



Фота Надзеі БУЖАН.

**Дзверы нам адчынілі шэсць унукаў Галіны СУШЫЦКАЙ, побач з імі радасна віляла хвосцікам такса Рычы. «Знаёмцеся: гэта — Кузьма, Леў, Станіслаў, Антоній, Анастасія, Ангеліна, — выглядвае з пакоя бабуля-клаўнеса. — Старэйшага ўнука — Кацпера — у ваенкамат выклікалі, ён у нас ужо дарослы, вучыцца ва ўніверсітэце». Убачыўшы фотаапарат, брацікі і сястрычкі імгненна сталі ў радок ля шафы. «Дзеці, зрабіце сумныя твары. А цяпер вясёлыя, закаханыя...» Адно задавальненне назіраць, як артыстычна малыя выконваюць бабуліны каманды.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Праект «з разыначкай»

# ЧАРОЎНЫ СВЕТ ВАРВАРЫ

## Мама напісала кнігу па казках сваёй трохгадовай дачкі

**Дзядуля Эспэн і цётачка Разарыя, пчолка Пенябіпка і вусень Бабу Ба Біба. Усе яны — жыхары чароўнага ружовага лесу, прыдуманага трохгадовай Варай. Праз іх маленькая дзяўчынка расказвала пра свае страхі, перажыванні, надзеі і адкрыцці. Яе мама, Алена Тагіль, уважліва слухала, а аднойчы пачала запісваць...**

— У душы я даўно паэтка і казачніца, — расказвае Алена. — У школе мела шмат грамат і першыя месцы на літаратурных конкурсах. Але ў сёмым класе мяне неяк моцна засаромілі, і, як гэта бывае ў дзяцей, пісаць я перастала. Неяк натрапіла на маркетынг і стала ў ім добра разбірацца. Я строіла стратэгіі памерам з нью-ёркскія хмарачосы. Але аднойчы да мяне прыляцела цудоўная дзяўчынка — мая дачка Варвара, і ўсе дамы адразу сталі маленькімі, а стратэгіі не такімі важнымі. Дзелавыя касцюмы разам з туфлямі на абцасах добраахвотна адправіліся з шафы ў скрынку з паметкай «Даўно мінула». Паэтка і казачніца прачнуліся зноў. І цяпер я ледзь паспяваю запісваць усе тыя цуды, што з намі адбываюцца.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*



Калі аднойчы Вара захоча стаць пісьменніцай, мама падтрымае яе выбар.